Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
“Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”

# Выбар прафесіі – выбар будучыні

Прафесійная арыентацыі навучэнцаў сродкамі турызма і краязнаўства



Педагог дадатковай адукацыі –
Вайцяховіч А.У.

# УВОДЗІНЫ

Ролю педагога дадатковай адукацыі па фарміраванні ўсебакова развітога, гатовага да працоўнай дзейнасці падрастаючага пакалення абумоўлівае вядучую пазіцыю педагагічных калектываў у адзіным шматгранным працэсе прафесійнай арыентацыі, што ажыццяўляецца установай адукацыі, сям'ёй, усёй грамадскасцю. Педагог дадатковай адукацыі дапамагае навучэнцам усвядоміць іх схільнасці і здольнасці, накіроўвае развіццё іх прафесійных інтарэсаў. Педагог павінен умець, у залежнасці ад педагагічнай сітуацыі, ад сваіх уласных магчымасцяў, інтарэсаў і здольнасцяў школьнікаў падабраць комплекс педагагічных сродкаў, метадаў ўздзеяння на асобу, каб дасягнуць мэты прафарыентацыі, рэалізаваць той шырокі круг задач падрыхтоўкі моладзі да выбару прафесіі, якія заклікана вырашаць установа дадатковай адукацыі. І ў той жа час прафесійная арыентацыя садзейнічае рацыянальнаму размеркаванню працоўных рэсурсаў грамадства ў адпаведнасці з інтарэсамі, схільнасцямі, магчымасцямі асобы і патрэбамі народнай гаспадаркі ў кадрах пэўных прафесій.

Выбар прафесіі прадвызначае поспех кар'ернага і жыццёвага шляху чалавека, таму дапамога навучэнцу ў выбары прафесіі з боку педагогаў не толькі дапамагае яму арганізаваць сваю вучэбную дзейнасць, але і надае ўпэўненасць у адносінах да сваёй будучыні.

У наш час, назіраецца небывалы рост аб'ёма інфармацыі, ад кожнага чалавека патрабуецца высокі ўзровень прафесіяналізму і такія дзелавыя якасці як прадпрымальнасць, здольнасць арыентавацца, прымаць рашэнні, браць адказнасць на сябе. Усё гэта немагчыма без умення творча працаваць.

Сёння мы назіраем за нашымі навучэнцамі і бачым інертнасць і пасіўнасць іх мыслення, атсутнасць уласнага пункту гледжання, няўменне яго даказаць. Каласальны паток інфармацыі не ўспрымаецца вучнямі самастойна. Гэта вядзе к таму, што нашы навучэнцы ўвогуле перастаюць думаць і разважаць, яны проста запамінаюць і ўзнаўляюць матэрыял. Выправіць гэта становішча і павінен педагог дадатковай адукацыі з дапамогай арганізацыі турысцка-краязнаўчай дзейнасці, якая дазваляе не перагружаць дзяцей ведамі, а абуджаць у іх цікавасць і імкненне да самастойнага пошуку.

Турысцка-краязнаўчая дзейнасць стымулюе творчы вобраз жыцця, развівае пачуццё еднасці з іншымі і з мірам уцэлым, пашырае масштаб яго ўспрымання. Тым самым ствараюцца неабходныя прадпасылкі і для больш глыбокага пачуцця Радзімы, большай цэласнасці патрыятычнага ўсведамлення, патрыятычных пачуццяў.

Можна зрабіць вывад, што ніякая сістэма прыёмаў навучання не будзе па-сапраўднаму эфектыўнай, калі не знойдзены шляхі супрацоўніцтва са сваімі навучэнцамі. Менавіта турысцка-краязнаўчая дзейнасць дае шырокі прастор для самавыражэння і самавызначэння. Прымяняючы рознабаковыя метады і формы ў рабоце з навучэнцамі, ствараючы атмасферу зацікаўленасці ў выніках сваёй дзейнасці праз публічныя выступленні, удзел ў розных краязнаўчых і даследчых конкурсах, турысцкіх спаборніцтвах, друкаванне ў сродках масавай інфармацыі і г.д. можна стварыць сітуацыю, якая дазволіць кожнаму навучэнцу праявіць самастойнасць, ініцыятыву, стымуляваць свабоду мыслення, выказвання без баязні памыліцца, уменне самастойна мысліць, аналізаваць, рабіць вывады.

Вопыт работы аб'яднання па інтарэсах "Турызм" з'яўляецца асновай сістэмы "урокі гісторыі і геаграфіі – фізічная загартоўка – аб'яднанне па інтарэсах – пазакласная работа". Навізна выкананага педагагічнага вопыту заключаецца ў тым, што ў ім праблема прафесійнага выбару, самавыражэння навучэнцаў на занятках аб'яднання па інтарэсах вырашаецца на аснове турысцка-краязнаўчай дзейнасці і ва ўмовах асабіста-арыентаванага падыходу ў навучанні.

Зыходзячы з вышэй сказанага атрымліваецца, што актуальнасць дадзенай работы заключаецца перш за ўсё ў прафесійнай накіраванасці і выхаванні патрыятычных якасцей падрастаючага пакалення. А важнейшай формай патрыятычнага выхавання з'яўляюцца заняткі па турызму і краязнаўству, збор, вывучэнне краязнаўчага матэрыялу і выкарыстанне яго як на профільных занятках у навучальнай установе, так і ў паўсядзённым жыцці. Любіць магутную, багатую і паспяховую краіну лёгка. Куды цяжэй знайсці штосьці цікавае, значнае і тое, што выклікае пачуццё гонару за свой маленькі горад альбо вёску. І тым не менш, менавіта ад любві да сваёй маленькай радзімы і пачынаецца любоў да сваёй краіны.

Для заняткаў турысцка-краязнаўчай дзейнасцю не трэба вялікіх выдаткаў, не трэба доўгіх паездак і дарагога абсталявання. Дастаткова ўважліва прыгледзецца да людзей, якія жывуць вакол цябе, вывучыць падшыўкі старых газет, здзейсніць турыстычны паход ці экскурсію па роднаму краю. І толькі тады малая радзіма адкрые масу сваіх таямніц, масу такіх фактараў, якія змогуць выклікаць любоў і павагу да роднай зямлі, гонар за яе гісторыю і культуру. І стане бачна, што без малой радзімы гісторыя Беларусі была б не поўнай, што ўся наша краіна складаецца з вялікай колькасці такіх непаўторных мястэчкаў, як на Докшыччыне.

А для гэтага, першай умовай выніковасці краязнаўча-даследчай працы на занятках аб'яднання па інтарэсах, лічу, будуць глыбокія пазнанні гісторы

свайго краю самім педагогам. Другой умовай выніковасці з’яўляецца сістэматычнае выкарыстанне мясцовага матэрыялу на занятках, пастаянная практычная работа, перспектыўнае яе планаванне ў масштабе ўсёй установы дадатковай адукацыі. Трэцяя ўмова – турысцка-краязнаўчай дзейнасці неабходна больш глыбокая навуковая аснова.

Для паспяховага вырашэння гэтых умоў я стаўлю перад сабой наступныя задачы:

– дапамагчы кожнаму навучэнцу ўдасканаліць свае індывідуальныя здольнасці, развіцца як асобе;

– асвоіць новыя формы турысцка-краязнаўчай і даследчай работы;

– навучыць дзяцей працаваць з краязнаўчымі матэрыяламі і літаратурнымі даведнікамі;

– выхоўваць патрыятызм і грамадзянскасць у навучэнцаў;

– садзейнічаць прафесійнаму выбару навучэнцаў.

ЖЫВУ Ў БЕЛАРУСІ - І ТЫМ ГАНАРУСЯ

# Роля дзіцячага турызму ў фарміраванні асноў прафесійнай арыентацыі навучэнцаў





Кім я буду? Якую прафесію я выберу ў будучыні? Такія пытанні задае сабе дзіця з ранняга ўзросту, як толькі пачынае сваю жыццядзейнасць, спрабуе ацэньваць сябе і свае ўчынкі, будаваць свае планы на будучыню.

У розных адукацыйных нарматыўна-прававых дакументах Рэспублікі Беларусь пазаўрочнай дзейнасці навучэнцаў нададзена асаблівая ўвага. Менавіта ў пазаўрочных занятках вызначана месца па прафарыентацыі дзіцяці, па фарміраванню ў навучэнцаў каштоўнасных адносін да працы, разумення яго ролі ў жыцці чалавека і ў грамадстве, развіццю цікавасці да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, заснаванай на пасільнай практычнай уключанасці ў розныя яе віды, у тым ліку сацыяльную, працоўную, гульнявую, даследчую.

Аб’яднанні па інтарэсах турысцка-краязнаўчай накіраванасці правамерна займаюць асаблівае месца ў сістэме дадатковай адукацыі. Спартыўны турызм з элементамі краязнаўства дае магчымасць не толькі прасякнуцца любоўю да малой радзімы, беражліва ставіцца да прыроды, прапагандаваць здаровы лад жыцця, пазнаваць навакольны свет, але і фарміраваць у дзіцяці стаўленне да сябе як да суб'екта будучай прафесійнай дзейнасці. Менавіта заняткі турызмам спрыяюць набыццю неабходнага жыццёвага вопыту. Усе людзі паступаюць так, як яны навучаны. У нашым жыцці заўсёды будуць узнікаць такія ўмовы, калі здароўе, бяспека, а часам і жыццё чалавека залежаць выключна ад яго своечасовых і пісьменных дзеянняў. Гэта практычна працэс выжывання ў цяжкіх умовах, калі дзіця прымяняе на практыцы ўсе атрыманыя веды і ўяўленні аб многіх прафесіях. Напрыклад, аб прафесіі повара, калі вылічвае, колькі трэба засыпаць крупы ў кацёл, каб не стаць героем аповеду Н. Носава «Мишкина каша». Веды тапаграфіі спатрэбяцца, каб не заблудзіцца ў лесе. Ёсць у турыстаў вельмі адказная пасада – кастравы. Гэты чалавек павінен ведаць усё аб вогнішчах і валодаць элементарнымі навыкамі пажарнага. Паглядзіш у лесе на прыгажуна – мухомора і як тут не стаць біёлагам. А колькі ў лесе небяспек падцікоўвае: удары, расцяжэння, крывацёкі, сінякі. Элементарныя веды па медыцыне дапамогуць аказаць першую медыцынскую дапамогу, а можа быць будуць вызначальнымі ў будучыні выбары прафесіі лекара. Многіх дзяцей так захапляе навука метэаралогія, што яны з лёгкасцю могуць сказаць, якое надвор'е чакае ўдзельнікаў паходу заўтра. Спатрэбяцца тут веды аб народных прыметах, вопыт людзей, назапашаны гадамі. Турызм – гэта такі від дзейнасці, калі дзеці вучацца правільна мець зносіны адзін з адным, знаходзіць кампраміс, мірна існаваць у групе, знаходзіць правільны выхад з экстрэмальных сітуацый. Той, у каго гэта атрымліваецца лепш за ўсё, магчыма, у будучыні стане дыпламатам. Заняткі ў аб’яднанні аб'ядноўваюць

у сабе шэраг школьных дысцыплін (геаграфію, біялогію. экалогію, фізічную культуру, фізіку, асновы бяспекі жыццядзейнасці), а гэтак жа прадметаў пазашкольнай праграмы (псіхалогію, тапаграфію, тапаніміку і інш.)

Праца ў турысцка-краязнаўчым аб’яднанні – гэта той перыяд, калі дзіця насычае сваю свядомасць разнастайнымі канкрэтна-навуковымі ўяўленнямі аб свеце прафесій, таму вельмі важна стварыць максімальна разнастайную палітру гэтых уражанняў каб затым, на аснове гэтага матэрыялу, навучэнец мог аналізаваць прафесійную сферу больш асэнсавана і адчуваць сябе больш упэўнена ў сваіх прафесійных перавагах.

За тыя гады, якія існуе наша аб’яднанне па інтарэсах “Турызм” мы абыйшлі ўсю Віцебскую вобласць, змаглі назіраць дзіўныя архітэктурныя пабудовы Гродненскай вобласці, пазнаёміліся з цікавым і непаўторным краем – Беларускае Палессе, здейснілі падарожжы па нашым прамысловым цэнтры – Мінскай вобласці. Не змаглі не завітаць і да нашых суседзяў – Расію.

Хочацца падкрэсліць, што турысцкія прагулкі, паходы і падарожжы па родным краі дапамагаюць педагогам працэс навучання зрабіць больш эфектыўным, даць магчымасць вучням далучыцца да сапраўдных ведаў, глыбей адчуць радасць пазнання, паўней зразумець гістарычныя і прыродныя з’явы, і, з вялікай доляй верагоднасці, знайсці сябе ў будучай прафесіі.

# Прафарыентацыйная работа ў аб’яднанні сродкамі краязнаўства



Адным са сродкаў грамадзянска-патрыятычнага і маральнага выхавання навучэнцаў з’яўляецца краязнаўства. Падчас краязнаўчай работы ў дзяцей фарміруецца інтарэс да вывучэння гісторыі краіны, роднага горада, вёскі. Любоў да Радзімы пачынаецца з канкрэтных ведаў пра вуліцу, раён, горад, вёску, дзе мы жывём. Гэтыя веды навучэнцы могуць атрымаць на занятках аб’яднання па інтарэсах “Турызм”.

Асноўным напрамкам у рабоце па прафарыентацыі школьнікаў на ўсіх стадыях навучання застаецца своечасовае, на ўсім працягу вучобы, пашырэнне кругагляду і інтарэсаў дзіцяці, азнаямленне яго з рознымі відамі дзейнасці і практычнае далучэнне да працы. Неабходна навучыць падлетка, перш за ўсё, ацэньваць сябе ў кантэксце патрабаванняў рынку, што дапаможа яму адаптавацца ў дарослым жыцці, магчыма, нават, нягледзячы на неспрыяльныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы. У дадзеным аспекце заняткі па краязнаўству валодаюць практычна неабмежаваным патэнцыялам выхаваўчага ўздзеяння на розумы і душы дзяцей і падлеткаў. Атрымаўшы першапачатковыя веды прафарыентацыйнага характару, адэкватна ацаніўшы свае схільнасці, інтарэсы і ўменні, падлетак зможа прымаць свядомыя рашэнні адносна свайго далейшага навучання і выбару прафесіі.

Работа ў нашым аб’яднання пачалася з таго, што мы вырашылі апісаць гісторыю вёсак Докшыцкага краю. На працягу некалькіх гадоў збіраўся матэрыял па гісторыі населенных пунктаў, пра іх помнікі гісторыі і культуры, вядомых землякоў і цікавыя мясціны. Сабраны матэрыял быў аформлены ў выглядзе інфармацыйнага даведніка “Вёскі Докшыцкага краю”, які выйшаў у свет у 2012 годзе.

Наступная наша значная праца заключалася ў выданні зборніка “Адкрытая кніга Докшыччыны”, дзе былі размешчаны матэрыялы экскурсій і падарожжаў па роднаму краю. Дарэчы гэты зборнік быў высока ацэнены па выніках XVI Рэспубліканскай выставы навукова-метадычнай літаратуры, педагагічнага вопыту і творчасці навучэнскай моладзі ў 2015 годзе.

Адна з задач аб’яднання – пашырыць магчымасці самастойнай работы з дакументамі, большасць з якіх звязаны з пошукавай дзейнасцю. Займаючыся краязнаўствам, навучэнцы адчуваюць грамадскую карысць пошукавай справы. Гэта павышае самаацэнку, прымушае іх паверыць ва ўласныя сілы, фарміруе актыўную жыццёвую пазіцыю.

Пошукавая дзейнасць навучэнцаў уключае збор, апрацоўку, сістэматызацыю і захоўванне матэрыялаў, вядзенне перапіскі і прапаганду вынікаў пошуку. Для большай эфектыўнасці работы наладжваюцца кантакты з рознымі арганізацыямі і ўстановамі, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны,

сведкамі ваенных падзей, настаўнікамі гісторыі і бацькамі дзяцей. Юныя краязнаўцы неаднаразова звярталіся па дапамогу да насельніцтва.

Навучэнцы з'яўляюцца актыўнымі турыстамі і праваднікамі па мясцінах баявой славы Докшыччыны. Кожны ўмее распальваць вогнішча і арыентавацца на мясцовасці, ведае і выконвае правілы тэхнікі бяспекі, можа аказаць першую медыцынскую дапамогу пацярпеламу, умее карыстацца неабходным турыстычным інвентаром і гатаваць ежу ў паходных умовах. Тэарэтычныя веды навучэнцы неаднаразова пацвярджалі практычнымі справамі, дзе заўсёды праяўлялі сябе згуртаваным калектывам. За гады свайго існавання аб'яднанне па інтарэсах "Турызм" было неаднаразова ўзнагароджана дыпломамі пераможцаў у абласным і рэспубліканскім конкурсе на лепшы турысцкі паход з навучэнцамі "Пазнай Радзіму – выхавай сябе".

Удзел у паходах, экскурсіях, навукова-практычных канферэнцыях і алімпіядах па краязнаўстве дапамагае навучэнцам у выбары будучай прафесіі. Радуе, што многія юныя краязнаўцы выбіраюць у далейшым прафесію настаўніка гісторыі, геаграфіі.

Патрыятызм нельга прывіць прымусова. Майстэрства педагога заключаецца ў тым, каб расказаць пра вернасць Айчыне, гуманізм і грамадзянскі гонар без павучанняў і рэкамендацый. Толькі ўласным прыкладам і павагай да людзей і роднай зямлі можна далучыць школьнікаў да агульначалавечых маральных каштоўнасцей. Таму прыемна бачыць, як твае былыя навучэнцы выбіраюць у якасці сваёй прафесіі працу ў органах унутраных спраў, МНС, узброеных сілах Рэспублікі Беларусь і г.д.

Краязнаўства – гэта цудоўная школа выхавання грамадзянскасці і фарміравання асноў жыццёвага самавызначэння. Краязнаўства трэба разумець шырока: гэта і наша мінулае, і наша сённяшняе, якое фарміруе нашу будучыню. Выкарыстанне ў адукацыйным працэсе краязнаўчага матэрыялу дазваляе выхоўваць у дзяцей павагу да малой Радзімы, яе мінулага, культурных каштоўнасцей і землякоў, а таксама фарміраваць веды пра побыт, заняткі, гаспадарчае жыццё і абрады продкаў. Сувязь моладзі з матэрыяльнай і духоўнай спадчынай дапамагае ёй не толькі ацаніць мінулае і сённяшняе, але і пазнаць сябе ў жыцці, вызначыцца ў будучыні.

# Роля гульнявых метадаў па краязнаўству ў прафесіянальнай арыентацыі навучэнцаў



Сярод задач, якія стаяць перад сучаснай адукацыяй, адно з прыярытэтных месцаў займае выхаванне грамадзяніна, патрыёта. Вырашэнне гэтай праблемы можа мець шмат варыянтаў. Адзін з іх звязаны з краязнаўчай работай.

Ідэя выкарыстання краязнаўчага матэрыялу ў навучальна-выхаваўчым працэсе выказвалася яшчэ педагогамі мінулага. Сапраўды, краязнаўчыя веды садзейнічаюць больш трываламу засваенню гістарычных падзей і паспяховаму вырашэнню выхаваўчых задач, надаюць вывучаемаму прадмету непаўторны каларыт, дапамагаюць звязаць жыццё роднай зямлі з паняццем “Радзіма”, а любоў да роднага краю жывіць любоў да яе. Вывучэнне мясцовых гістарычных падзей нібы набліжае гістарычнае мінулае да свядомасці вучняў, робіць яго цікавым і зразумелым.

Запас краязнаўчага матэрыялу, летапіс свайго краю значна аблягчае працу педагога, дапамагае павышаць трываласць ведаў навучэнцаў, прывіць ім жаданне да пошуку. Умела выкарыстаныя звесткі робяць занятак цікавым, прывіваюць навучэнцам любоў да Радзімы. Выкарыстаць іх можна ў рознай форме.

Якія матэрыялы па гісторыі краю я адбіраю для заняткаў? Па-першае, гэта навукова дакладныя факты мясцовай гісторыі, што дапамагаюць правільнаму разуменню гістарычных заканамернасцей. Па-другое, яны павінны мець важнае выхаваўчае значэнне, уздзейнічаць на свядомасць і пачуцці навучэнцаў, выклікаць цікавасць і любоў да гісторыі краю і краіны, быць накіраваны на прафарыентаванне. Яны адлюстроўваюць жыццё і дзейнасць знакамітых землякоў (палітыкаў, дзеячаў культуры, навукі, змагароў за незалежнасць Радзімы, герояў вайны і працы); паказваюць сацыяльна-эканамічнае і культурнае значэнне роднага краю (горада, раёна, вобласці) у масштабе краіны і асаблівасці яго гістарычнага развіцця, міжнародныя сувязі і перспектывы развіцця.

Асноўная асаблівасць краязнаўчай работы ў аб’яднанні – яе добраахвотны характар, магчымасць задавальнення і далейшага развіцця пазнавальных запатрабаванняў і схільнасцей навучэнцаў, шырокія магчымасці ў выбары формаў і метадаў работы. Зыходзячы з колькасці тых, хто ўдзельнічае ў краязнаўчай рабоце, формы яе падзяляюцца на індывідуальныя, групавыя і масавыя. Індывідуальная форма прадугледжвае чытанне літаратуры па мясцовай гісторыі, працу з дакументамі, рэчавымі матэрыяламі, падрыхтоўку паведамленняў, дакладаў, рэфератаў, збор успамінаў, прадметаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, апісанне помнікаў гісторыі, выраб наглядных дапаможнікаў і г.д. Групавая форма работы ў гуртках і суполках, экскурсіі, паходы, экспедыцыі, выпуск насценгазет,

рукапісных часопісаў. Да масавых формаў адносяцца краязнаўчыя гульні, вечары, віктарыны, алімпіяды, канферэнцыі і г.д. Аднак усе яны знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі паміж сабою. Масавая работа ўзбагачае работу ў аб’яднанні, а вынікі заняткаў у апошніх часта выносяцца на агульнашкольныя вечары, алімпіяды, канферэнцыі. Індывідуальная работа – неабходны элемент як масавых, так і групавых формаў. Але аснова, на якой можа грунтавацца ўся праца, – часцей за ўсё аб’яднанне па інтарэсах, якое праводзіць сваю работу згодна з вызначанай тэматыкай і планам.

Гульня – адна з актыўных формаў прафарыентацыі навучэнцаў. У працэсе гульні ўдзельнікі ўступаюць у пэўныя сацыяльныя і псіхалагічныя адносіны, яны “спрабуюць” сябе ў ролі прафесіяналаў, выконваючы асобныя элементы і нават комплекс уласцівых ім абавязкаў.

Разнастайнасць форм і метадаў краязнаўчай працы ў рабоце аб’яднання патрабуе асаблівага падыходу да методыкі арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэса, вызначэння таленавітых і творчых навучэнцаў. Таму з мэтай шырокага далучэння навучэнцаў да вывучэння гісторыі, культуры, прыроды, экалогіі роднага краю, пашырэння і паглыблення іх інтэлектуальных і пазнавальных магчымасцей, я часта выкарыстоўваю ў сваёй дзейнасці такія формы работы, як краязнаўчыя алімпіяды, віктарыны, інфармацыйныя хвілінкі і г.д. Перад такімі формамі працы ставіцца задача замацавання атрыманага на занятках аб’яднання краязнаўчага матэрыялу, а таксама выяўлення ўмення навучэнцаў паслядоўна і вобразна выкладаць матэрыял.

Прыведзеныя мною розныя формы прафарыентацыйнай работы з навучэнцамі ў сённяшні час найбольш эфектыўныя. Яны прыцягваюць увагу школьнікаў да праблем рэгіёна, спрыяюць пасільнаму ўдзелу ў іх вырашэнні. Даследчая дзейнасць спрыяе развіццю ўмення знаходзіць практычнае прымяненне навуковых ведаў, бачыць і вырашаць праблемы на сучасным навуковым узроўні, дае яснае ўяўленне аб змесце і ўмовах працы ў абранай прафесіі. Усё гэта дапаможа выпускніку зрабіць абгрунтаваны выбар будучай прафесіі.

## Заключэнне

Праблема прафесійнага самавызначэння заўсёды з'яўлялася важнай як для кожнага канкрэтнага чалавека, так і для ўсяго грамадства ў цэлым. Толькі праца ў адпаведнасці са сваімі здольнасцямі прыносіць чалавеку задавальненне а грамадству – прафесіянала высокага класа.

У цяперашні час значэнне прафарыентацыі няўхільна ўзрастае. Яна павінна спрыяць не толькі выбару прафесіі, але і паспяховасці яе магчымай змены, мабільнай перакваліфікацыі, адаптацыі і зменлівых умоў жыцця і прафесійнай дзейнасці. Усе ўзрастаючую канкурэнцыю на рынку працы могуць вытрымаць толькі спецыялісты высокай кваліфікацыі.

Я перакананы, што пачынаць працу па прафарыентацыі навучэнцаў неабходна не ў старэйшых класах, а ў самым пачатку школьнай дзейнасці дзіцяці. Навучэнцам часта не хапае ведаў аб свеце прафесій; аб тым, якія патрабаванні прад'яўляюцца да спецыяльнасці ў той ці іншай сферы працы. Моладзь недастаткова інфармавана аб сітуацыі на рынку працы, не гатовая да канкурэнцыі пры працаўладкаванні.

Таму, з улікам узроставых, псіхалагічных асаблівасцяў навучэнцаў на кожным этапе сваёй дзейнасці ў аб’яднанні па інтарэсах я стараюся мяняць задачы. На першым этапе прытрымліваюся каб у навучэнцаў пашыраліся пазнавальныя магчымасці, ці, другімі словамі – своеасаблівая “спроба сіл”. На другім этапе ідзе фарміраванне тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў, раскрыццё творчых здольнасцяў асобы ў абранай вобласці дзейнасці (альбо гэта турызм, альбо краязнаўства). Трэці этап – дасягненне павышанага ўзроўню ведаў, уменняў, навыкаў у абранай вобласці, стварэнне ўмоў для самарэалізацыі, самавызначэння асобы, яе прафарыентацыі.

З улікам вышэйсказанага можна вылучыць асноўныя функцыі турысцка-краязнаўчай дзейнасці:

1) адукацыйная – навучанне па дадатковых адукацыйных праграмах, атрыманне новых ведаў;

2) выхаваўчая – узбагачэнне і пашырэнне турысцка-краязнайчай асновы аб’яднання па інтарэсах, вызначэнне на гэтай аснове дакладных маральных і прафесійных арыенціраў;

3) крэатыўная – стварэнне гнуткай сістэмы для рэалізацыі індывідуальных творчых інтарэсаў асобы;

4) кампенсацыйная – засваенне навучэнцам новых напрамкаў дзейнасці, прадастаўленне дзіцяці пэўных гарантый дасягнення поспеху ў абраных ім сферах турысцка-краязнаўчай дзейнасці;

5) рэкрэацыйная – арганізацыя змястоўнага вольнага часу навучэнцаў, аднаўлення ў іх псіха-фізічных сіл;

6) прафарыентацыйная – фарміраванне ўстойлівай цікавасці да сацыяльна значных відаў дзейнасці, садзейнічанне вызначэнню жыццёвых планаў, уключаючы перадпрафесійную арыентацыю;

7) функцыя сацыялізацыі – засваенне навучэнцам сацыяльнага вопыту, набыццё ім навыкаў узнаўлення сацыяльных сувязяў і асобасных якасцяў, неабходных для жыцця;

9) функцыя самарэалізацыі – самавызначэнне дзіцяці ў сацыяльнай і культурна значных формах жыццядзейнасці, перажыванне ім сітуацый поспеху, асобаснае самаразвіцце.

У аб'яднаннях турысцка-краязнаўчай накіраванасці маюцца шырокія магчымасці падрыхтоўкі навучэнцаў да ўсвядомленага выбару роду дзейнасці. Менавіта ў дадзенай накіраванасці дзеці атрымліваюць першасныя навыкі выжывання ў навакольным асяроддзі, спрабуюць сябе ў ролі даследчыка, вучыцца ствараць свае асаблівыя турысцка-бытавыя умовы і прадстаўляць яго карыстальнікам.

Удзел у рознага роду масавых мерапрыемствах дазваляе сфармаваць станоўчую эмацыйную ўстаноўку выхаванцаў на выбар магчымай прафесіі.

Правільны выбар прафесіі важны не толькі з пазіцый вызначэння жыццёвых планаў маладога чалавека, але і з пункту гледжання развіцця грамадства ў цэлым. Прафесійнае самавызначэнне доўжыцца на працягу ўсяго жыцця. На маю думку, вялікую дапамогу дзіцяці магло б аказаць стварэнне індывідуальнага маршруту перспектыўнага прафесійнага самавызначэння, рэалізацыя якога можа быць ўскладзена на ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей як асобасна-арыентаванай гнуткай, адкрытай сістэмы.

Як гаворыцца ў прыказцы: «Праца чалавека корміць». І я з гэтым згодны, таму што праца – аснова ўсяго жыцця чалавека. А вось якая будзе гэтая аснова ў маленькага чалавечка, залежыць ад таго, як мы – педагогі – зможам падрыхтаваць яго да аднаго з самых галоўных рашэнняў яго жыцця – выбар прафесіі.